МІЖНАРОДНАЕ ГРАМАДСКАЕ АБ’ЯДНАННЕ “ЗГУРТАВАННЕ БЕЛАРУСАЎ СВЕТУ “БАЦЬКАЎШЧЫНА”

№3 (74)
сакавік
2008

# БЕЛАРУСЫ Ў СВЕЦЕ

ІНФАРМАЦЫЙНЫ БЮЛЕТЭНЬ

## У НУМАРЫ:

### 90-ГОДДЗЕ БНР У ЗАМЕЖЖЫ

Агляд навінаў, якія адбыліся ў дыяспары і прымеркаваныя да ўгодкаў БНР.

*Працяг на стар. 2-3*

### ПРЭЗЕНТАЦЫЯ КНІГІ І. СУРВІЛЛЫ “ДАРОГА”

У зале не было вольных месцаў – сабралася каля 200 чалавек. Кніжку І. Сурвіллы можна было атрымаць адразу на ўваходзе.

*Працяг на стар. 4*

### МАРАЧКІН АРЫШТАВАНЫ НА 5 СУТАК

24 сакавіка амаль а 10-й вечара ў майстэрні мастака, кіраўніка МГА “Згуртаванне беларусаў свету “Бацькаўшчына” Аляксея Марачкіна з’явілася міліцыя. Яны забралі некалькі расцяжак, падрыхтаваных да Дня Волі, а самога мастака арыштавалі.

*Працяг на стар. 5*

### ПРЫСВЯЧАЕЦЦА 90-ГОДДЗЮ БНР

Да 90-годдзя Беларускай Народнай Рэспублікі “Згуртаванне беларусаў свету “Бацькаўшчына” ладзіла і ўдзельнічала ў арганізацыі шматлікіх святочных мерапрыемстваў і сустрэч са знакамітымі людзьмі Беларусі, а таксама выпусціла ў свет некалькі друкаваных выданняў.

*Працяг на стар. 6*

### НАВІНЫ ДЫЯСПАРЫ

У сакавіку сябры “Беларускай Нацыянальнай Памяці” наведалі беларускую дыяспару Італіі. Традыцыйна праграма візітаў уключае наведванне памятных мясцінаў, звязаных з Беларуссю, яе гісторыяй ды культурай, а таксама месцаў мартыралогіі.

*Працяг на стар. 7-8*

## ВІТАННЕ АД СТАРШЫНІ РАДЫ БНР

*Увесь тэкст змешчаны на сайце:* http://zbsb.org

Дарагія Суродзічы!

Вітаю Вас зь вялікім Юбілеем у жыцыці беларускага народу: дзевяностымі ўгодкамі абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.

Пасьля стагодзьдзя жудаснай няволі і этнацыду, пасьля чатырох гадоў голаду і мукаў спрычыненых чужой вайной на беларускай зямлі, народ наш знайшоў у сабе сілу і годнасьць абвесьціць сьвету, што ён таксама хоча жыць вольным на гэтай зямлі, што ён таксама мае права быць гаспадаром у сваей хаце…

…Беларуская Народная Рэспубліка ня ўсьпела аднак замацаваць новаабвешчаную дзяржаву. Хаця суседзі яе прызналі, нашым паслом у Вэрсалі не ўдалося абараніць права беларускага народу на самавызначэньне. Ворагі нашыя былі мацнейшымі. І Беларусь у тыя часы ня мела ў Вашынгтоне, Лёндане і Парыжы сяброў, якія лябіравалі-б на яе карысьць, такіх якіх мелі Палякі і Балты. Абвешчаньне Беларускай Народнай Рэспублікі змусіла аднак захопнікаў стварыць БССР. Рэшту гісторыі Вы ведаеце.

Савецкі пэрыяд нашай гісторыі я назвала-б пэрыядам ВЯЛІКАЙ ХЛУСЬНІ. БССР была васалам дзяржавы, якой кіравалі адны з найбольш дзікіх злачынцаў у гіс-

*Працяг на стар.4*

## Дзень Волі-2008



25 сакавіка ў цэнтры Мінска адбылася вулічная акцыя, прымеркаваная да 90-годдзя абвяшчэння незалежнасці БНР. Па розных звестках, у ёй узялі ўдзел ад 4 да 5 тысяч чалавек. Апазіцыя чакала і спадзявалася, што ў гэтым годзе ўлада пойдзе ўсё ж такі на саступкі і дасць спакойна правесці мерапрыемства. Але, відаць, у міліцыі і ўлады былі на Дзень Волі іншыя планы. Як і ў мінулыя гады, дзеянні міліцыі былі вельмі жорсткімі. Як вынік – больш за 100 чалавек затрымана і збіта міліцыянтамі падчас мірнай дэманстрацыі, сярод якіх моладзь, журналісты, пенсіянеры. Дубінка не выбірала каго біць, дубінка біла ўсіх.

Разагнаўшы Дзень Волі, улада вярнула Беларусь у мінулае. У тую Беларусь, якой яна была яшчэ два гады таму, калі супраць мірных шэсцяў выстаўлялі баевікоў у міліцэйскай форме. Улада перакрэсліла ўсе крокі лібералізацыі, якія рабіліся апошнія месяцы. Жорстка разагнаўшы дэманстрантаў на Дзень Волі, улада дала зразумець, што гульні ў дэмакратызацыю скончыліся, ёй усё роўна, што на гэта скажуць Брусель і Вашынгтон.

26 сакавіка мінскія суды захлынуліся ад вынясення прысудаў затрыманым падчас акцыі Дня Волі. Вынясенне прысудаў пастаўлена на канвеер, і затрыманыя атрымліваюць ад 5 да 15 сутак арышту.

## МЕЛЬБУРН (АЎСТРАЛІЯ)

**У Мельбурне адбылося ўрачыстае пасяджэнне.**

Яго арганізаваў Беларускі Цэнтральны Камітэт разам з Беларускай Аўтакефальнай Царквой святых віленскіх пакутнікаў. Старшыня БЦК Янка Барысевіч зачытаў даклад, прысвечаны ўгодкам БНР, а сакратар БЦК Аўген Груша выступіў з прамовай. У мастацкай частцы А. Груша прадэкламаваў вершы, а мастацкі гурт "Каліна" выканаў беларускія песні. Вядома, такая ўрачыстая сустрэча не абыйшлася без гімна "Мы выйдзем шчыльнымі радамі".

*Паводле інфармацыі БЦК*

## БРУСЕЛЬ (БЕЛЬГІЯ)

**Ускладанне кветак да помніка невядомаму жаўнеру**

Традыцыйнае святкаванне 25 сакавіка ў Бельгіі распачалося з малітвы ў Беларускай грэка-каталіцкай царкве горада Антверпена. Пасля святочнага набажэнства прысутныя ўсклалі кветкі да помніка невядомаму жаўнеру ў Брусэлі.

*Паводле БЭЗ-інфо*

## ЛОНДАН (ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ)

**Дыск да Дня Волі**

Беларуская дыяспара Лондана выдала дыск да 90-годдзя БНР. Запісы зробленыя лонданскімі беларусамі Нінай Барборай Эванс, Сержуком Вінаградавым і вядомым гукарэжысёрам Браянам Эвансам. Музычныя апрацоўкі песняў маюць адбітак заходняй папулярнай культуры і вылучаюцца неардынарным спалучэннем розных музычных традыцыяй і стыляў. У зборнік увайшлі песні: "Мы выйдзем шчыльнымі радамі", "Магутны Божа", "Дробна-драбніца", "Шумныя бярозы".

*Ул.інф.*

## НЬЮ-ЁРК (ЗША)

**Урачыстасці з нагоды 90-годдзя БНР**

22 сакавіка Беларуска-Амерыканскае Задзіночанне і Згуртаванне Беларускай Моладзі ў Амерыцы правялі мітынг у гонар 90-годдзя БНР. Мерапрыемства прайшло каля штаб-кватэры ААН у Нью-Ёрку. У гонар свята ад імя ЗБМА 20 беларускіх дзяўчат і жанчын атрымалі па 3 ружы – дзве белыя і адну чырвоную. Адкрыў мітынг Старшыня БАЗА Віталь Зайка, які павіншаваў прысутных са святам і расказаў пра значнасць 25 сакавіка для захавання беларусаў як нацыі ва ўмовах замежжа. Старшыня ЗБМА Мікола Цімашэнка распавёў пра гісторыю свята і аддаў даніну пашаны Змагарам за Беларусь, якія адстойвалі ідэалы 25 сакавіка на плошчы Каліноўскага ў Мінску 19 сакавіка 2006 г.

Там жа, ля будынку штаб-кватэры ААН, адбылася дэманстрацыя і 23 сакавіка. 15 удзельнікаў трымалі бел-чырвона-белыя сцягі і плакаты. Пасля дэманстрацыі, святочныя імпрэзы адбыліся ў грамадскай залі Кафедральнага сабору св. Кірылы Тураўскага ў Брукліне, а ў Беларускім музеі, які месціцца ў тым жа будынку, адкрылася новая мастацкая выстава. Было прадстаўлена 32 працы, выкананыя ў розных стылях – ад імпрэсіянізму з рэалізмам да абстракцыі і кубізму. Беларусы Амерыкі, якія прыйшлі на святкаванне, напісалі агульнанацыянальную дыктоўку. Таксама нью-ёркскія беларусы сабралі ахвяраванні на ўсталяванне мемарыяльнай дошкі на былой амбасадзе БНР у Таліне.

*Паводле ЗБМА і БМРА*

## ТАРОНТА І АТАВА (КАНАДА)

**Свята ў двух гарадах**

Святочныя мерапрыемствы адбыліся ў двух канадскіх гарадах – Таронта і Атава. Арганізатары наўмысна зарганізавалі свята ў розныя дні, каб усе жадаючыя маглі наведаць беларускае свята. Так, таронтаўцы адсвяткавалі ўгодкі БНР 22 сакавіка ў залі Беларускага грамадска-рэлігійнага цэнтру. Там прайшоў Урачысты малебен, даклад і святочны канцэрт.

Аттаўцы плануюць ўрачыстасці на 5 красавіка. У праграме будуць святочныя віншаванні, канцэрт і святочная вячэра.

*Паводле Згуртавання беларусаў Канады*

## ВІЛЬНЯ (ЛІТВА)

**На Дзень Волі ў Вільні маліліся за беларускую мову**

25 сакавіка ў Вільні 90-я ўгодкі БНР адзначылі як свята для ўсяго горада – так, як гэта кожны год рабілася да 1939 года, г.зн. да прыходу сюды савецкай улады. Гэтым разам ладзілі свята не асобныя беларускія суполкі, а ўся беларуская грамада Вільні. Яшчэ раніцай калона актывістаў усклала вянок да помніка заснавальнікам БНР братам Івану і Антону Луцкевічам на мемарыяльных могілках Роса. Па абедзе ў гарадскім Доме настаўніка адбылася ўрачыстая акадэмія: публічная лекцыя доктара гісторыі Алеся Смаленчука, прывітанні ад дэпутатаў Літоўскага сейма і канцэрт бардаў В. Цярэшчанкі і З. Бартосіка. Пасля гэтага публіка рушыла шэсцем са сцягамі ў легендарныя Базыльянскія муры, дзе некалі працавалі Беларуская гімназія і музей. Тут у Свята-Троіцкай царкве айцец Іван Даўкшыс адслужыў урачыстае набажэнства за Беларусь, беларускі народ і беларускую мову. Усяго ў святкаванні бралі ўдзел некалькі сотняў чалавек.

*Сяргей Дубавец (Вільня)*

***

**Агульнанацыянальная дыктоўка ў Вільні адбылася 21 сакавіка**

Яна прайшла ў будынку Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта. Запрашэнні былі разасланыя студэнтам, педагогам, віленскім беларусам, парламентарыям і грамадскім дзеячам Літвы, якія вeдаюць беларускую мову.

*Паводле газеты "Свабода" (Літва)*

## БЕРЛІН (НЯМЕЧЧЫНА)

**Праваабаронцы праводзяць акцыю салідарнасці**

Акцыя прымеркаваная да другой гадавіны зняволення Аляксандра Казуліна і 90-х угодкаў БНР. Гэткім чынам арганізатары хочуць прыцягнуць увагу немцаў да сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі. Сярод патрабаванняў якія прагучалі 25 сакавіка ля будынку беларускай дыпламатычнай місіі, — неадкладна вызваліць палітвязня Казуліна, гарантаваць беларускім грамадзянам асноўныя дэмакратычныя правы, уключна з правам на правядзенне мірных сходаў. Нямецкія праваабаронцы звярнуліся да ўдзельнікаў акцыі з наступным: у перыяд паміж 25 і 28 сакавіка даслаць на адрас беларускай амбасады ў Берліне паштовы перавод на 1 еўрацэнт з пазнакай "Свабоду Казуліну".

*Паводле "Радыё Свабода"*

## ВАРШАВА (ПОЛЬШЧА)

**Маніфестацыя і канцэрт**

25 сакавіка ў дэманстрацыі "Салідарных з Беларуссю" прыняло ўдзел каля 300 чалавек, якія такім чынам выказалі падтрымку Беларусі ў дзень абвяшчэння БНР. Пераважная часта ўдзельнікаў – палякі, паколькі беларускія актывісты паехалі адзначаць Дзень Волі ў Мінск. Дэманстранты перадалі ў Сейм петыцыю з просьбай аб рэзалюцыі, у якой польскі Парламент выкажа супраціў аўтарытарнай ўладзе ў Беларусі. Але асноўная мэта – дэманстрацыя салідарнасці з беларусамі, якія адзначаюць 25 сакавіка ў Мінску, і нагадаць варшавякам аб праблемах у Беларусі. Увечары

гурт N.R.M. наладзіў жывы канцэрт у эфіры музычнай студыі "Польскага Радыё 3".

***

**Канцэрт "Салідарныя з Беларуссю"**

Штогадовы канцэрт "Салідарныя з Беларуссю" пройдзе ў Варшаве на Кантрактовай плошчы 30 сакавіка. Апроч польскіх рок-выканаўцаў і гуртоў на канцэрце збіраюцца выступіць беларускія рокеры Руся, Аляксандр Памідораў і Лявон Вольскі. Галоўная мэта канцэрту — падтрымка беларускай мовы, на якой спяваюць музыкі. Падчас канцэрту будуць збірацца грошы на падтрымку зачыненага ўладамі Беларусі ліцэя імя Я. Коласа ў Мінску. Канцэрт будзе транслявацца тэлеканалам "Белсат".

*Паводле газеты "Пагоня"*

## БЕЛАСТОК (ПОЛЬШЧА)

**У беластоцкай кавярні адбылася святочная вечарына**

Ва ўрачыстасці прынялі ўдзел дзеячы беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы, моладзь, польскія парламентарыі, прадстаўнікі ўладаў Беластока і Падляшскага ваяводства. З вітальным словам да прысутных звярнуўся пасол польскага Сейму Роберт Тышкевіч. У канцэртнай праграме выступіў маладзёвы хор "Знічка" з беларускага ліцэя ў Гайнаўцы, дзеці з беластоцкіх школ.

*Паводле "Радыё Рацыя"*

## МАСКВА (РАСІЯ)

**Мерапрыемствы да 90-годдзя БНР**

25 сакавіка, насупраць беларускай амбасады ў Маскве, прайшоў пікет з адным удзельнікам, што паводле расійскага заканадаўства дазваляецца праводзіць без дазволу. А 11 гадзіне да амбасады падыйшоў каардынатар расійскага маладзёвага руху "Абарона" Эдуард Глезін, які трымаў у руках плакат "На волю політзаключённых! День Воли!", але яго адразу ж затрымалі два супрацоўнікі міліцыі.

Увечары таго ж дня ля помніка Купалу беларуская дыяспара Масквы ўсклала кветкі беларускаму паэту, чыё імя стала сімвалам нацыянальнага адраджэння Беларусі ў ХХ ст.

А 29 сакавіка ў 13.30 у Расійскай дзяржаўнай бібліятэцы адбудзецца канцэрт Віктара Шалкевіча, прымеркаваны да юбілею БНР. Арганізатарамі з'яўляюцца Грамада беларускай культуры імя Ф. Скарыны, Беларускае зямляцтва Масквы.

*Паводле сайта "Беларуская Масква"*

## ЛЬВОЎ (УКРАІНА)

**Выдадзены адмысловы праваслаўны малебен**

15 сакавіка ў рамках праграмы святкавання 90-годдзя БНР адбылася прэзентацыя выдання адмысловага праваслаўнага малебена. Ягонай асаблівасцю з'яўляецца "Песня вольнасці", што складзена паводле старажытных беларускіх праваслаўных узораў. Малебен надрукаваны ў колькасці 50 асобнікаў і перададзены ў беларускія праваслаўныя супольнасці Ровеншчыны, Валыні і Чарнігаўшчыны. Таксама выданне змешчана ў інтэрнэт-бібліятэцы "Камунікат".

***

Святкаванне 90-годдзя БНР пачалося адмысловым малебнам. На службу сышліся не толькі львоўскія беларусы, а і госці з Валыні і Ровеншчыны. Пасля ўдзельнікі напісалі беларускую дыктоўку і прагледзілі фільм "Беларускі рэзыстанс". Удзельнікі святкавання прынялі адмысловы зварот да прэзідэнта Украіны з нагоды апошніх палітычных рэпрэсій у Беларусі, у прыватнасці арышту мастака Алеся Марачкіна і блакавання ва ўласным доме Алеся Пушкіна. У звароце патрабуецца спыніць вайсковыя і эканамічныя кантакты з рэжымам Лукашэнкі, забараніць уезд ва Украіну беларускіх урадаўцаў ды супрацоўнікаў КДБ і МУС.

*Беларуская праваслаўная парафія св. Кірылы Тураўскага*

## ПРАГА (ЧЭХІЯ)

**"Мінулае, сучаснасць і будучыня Беларускай Дзяржаўнасці"**

Пад такой назвай 22 сакавіка ў Празе адбылася канферэнцыя, прысвечаная 90-годдзю БНР, пры ўдзеле Карэла Шварцэнберга, міністра замежных спраў Чэшскай Рэспублікі. Перад удзельнікамі выступілі старшыня Рады БНР Івонка Сурвілла, старшыня КХП-БНФ Зянон Пазняк, рэдактары "Радыё Свабода" Сяргей Шупа і Сяргей Навумчык, пісьменнік Уладзімір Арлоў, прэзідэнт "Грамадзянскай Беларусі" Ян Румл, экс-старшыня "Маладога Фронту" Павел Севярынец.

*Паводле "Грамадзянскай Беларусі"*

## ТАЛІН (ЭСТОНІЯ)

Беларуска-Эстонскае Згуртаванне адзначыла 90-я ўгодкі БНР урачыстым святам, на якое былі запрошаны сябры з мясцовых суполак іншых нацыянальнасцяў, прадстаўнікі гарадскіх уладаў, уцекачы з Беларусі, якія зараз жывуць у Таліне. Была зроблена выстава беларускіх выданняў, гучалі вершы і песні, прысвечаныя Беларусі.

*Зінаіда Клыга*

# "БЕЛАРУСКІ ТЫДЗЕНЬ" У ЕЎРАПАРЛАМЕНЦЕ

10–13 сакавіка ў Страсбургу, у Еўрапарламенце прайшоў "Беларускі тыдзень", прысвечаны 90-годдзю БНР. Ініцыятыва яго правядзення належыць старшыні дэлегацыі па сувязях з Беларуссю, польскаму дэпутату Яцэку Пратасевічу з фракцыі Еўрапейскай народнай партыі/Еўрапейскіх дэмакратаў.

Першы дзень "Беларускага тыдня" ўключаў выставу прац мастакоў Алеся Марачкіна, Рыгора Сітніцы, фатографаў Ігара Крашэўскага і Юліі Дарашкевіч, выступ калектыва Зміцера Вайцюшкевіча "WZ Orchestra". Афіцыйная праграма пачалася з паказу фільма Юрыя Хашчавацкага "Беларусь — назад у Еўропу" і фільма Уладзіміра Арлова, Юрыя Хашчавацкага і Алега Дашкевіча "Дзень Волі".

Сярод запрошаных беларусаў – палітыкі Івонка Сурвілла, Аляксандр Мілінкевіч, Лявон Баршчэўскі, Яраслаў Раманчук, Павел Севярынец, а таксама сустаршыні Агульнанацыянальнага аргкамітэта па святкаванні 90-годдзя БНР Генадзь Бураўкін і Аляксей Марачкін, праваабаронцы Алесь Бяляцкі, Валянцін Стэфановіч і сацыёлаг Андрэй Вардамацкі.

На афіцыйнай цырымоніі 11 сакавіка з вітальнымі словамі звярнуліся старшыня Еўрапарламента Ханс-Герт Петэрынг, старшыня фракцыі Еўрапейскай народнай партыі Джозэф Доўл, старшыня камітэта па знешніх сувязях Еўрапарламента Яцэк Сарыўш-Вольскі, старшыня дэлегацыі Еўрапарламента па сувязях з Беларуссю Яцэк Пратасевіч, камісар Еўракамісіі па знешніх сувязях і еўрапейскай палітыцы добрасуседства Беніта Ферэра-Вальднер.

Удзельнікі "Беларускага тыдня" зладзілі абмен думкамі на тэму "Незалежная Беларусь – неад'емная частка Еўропы". Падымалася пытанне аб зніжэнні консульскіх збораў з беларусаў за шэнгенскія візы, што лабіруюць і дэпутаты Еўрапарламента. Упершыню працоўнай мовай тыдня былі англійская і беларуская.

*Паводле "Беларусаў і рынку"*



# Прэзентацыя кнігі Івонкі Сурвіллы “Дарога”

У сядзібе партыі БНФ адбылася прэзентацыя кнігі ўспамінаў старшыні Рады БНР Івонкі Сурвіллы **“Дарога. Стаўбцы. Капенгаген. Парыж. Мадрыд. Атава. Менск.”**

У зале не было вольных месцаў – сабралася каля 200 чалавек. Кніжку І. Сурвіллы можна было атрымаць адразу на ўваходзе.

На жаль, у прэзентацыі кнігі не брала ўдзелу аўтарка: у інтэрв’ю “Радыё Свабода” яна распавяла, што вельмі хацела б быць разам з удзельнікамі, але амбасадар Беларусі ў ЗША Міхаіл Хвастоў прапанаваў напісаць ліст Аляксандру Лукашэнку, каб яе ўпусцілі ў краіну. Спн. Сурвілла сказала, што абсалютна не гатовая напісаць такі ліст, да таго ж, яна лічыць ненармальным ехаць у Беларусь, калі сама змагаецца супраць цяперашняга рэжыму.

Кніга выйшла ў серыі “Бібліятэка Свабоды. XXI стагоддзе”. Вёў вечарыну заснавальнік і каардынатар серыі Аляксандр Лукашук. На прэзентацыі сваімі ўражаннямі пра кнігу дзяліліся дзеячы культуры, сярод іншых – пісьменнік Уладзімір Арлоў, гісторык Захар Шыбека, прысутныя слухалі ўрыўкі з кнігі, якія Івонка Сурвілла чытала на хвалях “Радыё Свабода”.

Адна з удзельніц прэзентацыі, старшыня Рады “Згуртавання беларусаў свету “Бацькаўшчына” Алена Макоўская сказала ў інтэрв’ю “Радыё Свабода”:

“Гэтая кніга мае вялікае значэнне, бо гэта ўспаміны дзейнага старшыні Рады БНР. Але найбольш мяне ўразіла тое, што Івонка Сурвілла ў кнізе адкрываецца не толькі як грамадскі дзеяч, палітык, але і як чалавек, як жанчына са сваімі пачуццямі, перажываннямі, як дачка і маці, як жонка, якая кахае свайго мужа і разам з ім працуе. Гэта ўспаміны вельмі глыбокага чалавека, чалавека з вельмі далікатным унутраным светам. Успаміны таксама адкрываюць некаторыя старонкі жыцця беларускай эміграцыі, якія да гэтага часу былі закрытыя – напрыклад, жыццё беларускай эміграцыі ў Даніі ці Іспаніі на тыя часы”.

*Паводле “Радыё Свабода”*

**11 красавіка Івонка Сурвілла святкуе дзень нараджэння. “Згуртаванне беларусаў свету “Бацькаўшчына” ганарыцца супрацоўніцтвам са спн. Івонкай. Зычыць творчага натхнення, надзейных паплечнікаў, далейшай плённай працы дзеля здзяйснення агульнай мары – Волі і Незалежнасці Беларусі.**

*Управа*
*МГА “ЗБС “Бацькаўчшына”*

## Вітанне ад старшыні Рады БНР

*Працяг. Пачатак на стар.1*

торыі чалавецтва. Дасюль ніхто не пабіў ліку – сто мільёнаў – ахвяраў камунізму.

Нішчыла Масква наш народ і аднaчасна пераконвала нашых паняволеных людзей, якія ня мелі доступу да праўды, што яна ёсьць тым “братнім народам”, без апекі якога яны ня могуць абыйсьціся.

Рада БНР у міжчасе, хаця ў экзылі, прадаўжала змаганьне за незалежнасьць. Яе прадстаўнікі ўва усім сьвеце былі тымі абаронцамі правоў беларускага народу, якіх ён ня меў у 1918-м годзе...

...Сёньня мы ведаем, што ідэалы гэтыя станучца рэчаіснасьцю, што наш народ зойме пачэснае месца між іншымі вольнымі народамі сьвету. Так як разваліласяя савецкая турма народаў, разваліцца і сёньняшняя дыктатура, якая пануе ў Беларусі. Разваліцца, бо расьце новае пакаленьне Дашкевічаў, Фінкевічаў і Севярынцаў, якія жывуць верай у лепшую будучыню Беларусі, і якія пяроймуць нашае змаганьне за ажыцьцяўленьне ідэалаў 25-га Сакавіка.

Беларускі народ зразумее, што няма будучыні без вольнай і незалежнай беларускай дзяржаву. Прыпомніць словы Кастуся Каліноўскага, які з-пад шыбеніцы папяраджаў нас, што зажывём мы спакойна і шчасьліва толькі калі Маскалёў ня будзе над намі, і адмовіць права халуём на службе чужакоў вырашаць наш лёс.

Хаця я ўжо не маладая, веру, што пабачу яшчэ вольную і незалежную Беларусь, такую, якой яна сёньня была-б, калі-б бальшавіцкія агрэсары не напалі на Беларускую Народную Рэспубліку і не зьняможылі яе.

Адродзім наш цудоўны край. Народ наш пераможа страх і ўваскрэсьне, так як Уваскрос Наш Госпад Ісус Хрыстос!

Дык памажы нам Божа! Жыве Беларусь!

*Івонка Сурвілла,*
*Старшыня Рады БНР*

## Зборнік сачыненняў пераможцаў дзіцячага конкурсу “Беларусь маёй будучыні”

У сакавіку “Згуртаванне беларусаў свету “Бацькаўшчына” выдала зборнік твораў пераможцаў дзіцячага конкурсу “Беларусь маёй будучыні”. Сам конкурс адбыўся ўвесну 2007 г. У ім узялі ўдзел больш за 300 вучняў, з якіх журы вызначыла пераможцамі 15 – у намінацыі “малюнак” і 30 – у намінацыі “літаратурны твор”. У прадмове да кнігі Ніна Шыдлоўская, намесніца старшыні Рады напісала: “Зададзеная конкурсам тэма падштурхнула многіх задумацца, хто такія беларусы, чым слаўны беларускі народ. Важнае пытанне, якое ўздымаюць дзеці ў сваіх творах, – лёс нашай роднай беларускай мовы”. Літаратурна-мастацкія конкурсы для школьнікаў, у асноўным на гістарычную тэматыку, Згуртаванне ладзіць ужо сем год пры падтрымцы кіраўніцы дабрачыннага фонду “Ethnic Voice of America” спн. Ірэны Каляды-Смірновай.

## МАРАЧКІН АРЫШТАВАНЫ НА 5 СУТАК

24 сакавіка амаль а 10-й вечара ў майстэрні мастака, кіраўніка МГА "Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына" Аляксея Марачкіна з'явілася міліцыя. Яны забралі некалькі расцяжак, падрыхтаваных да Дня Волі, а самога мастака арыштавалі.

25 сакавіка без адваката, раней прызначанага часу, была разгледжаная справа ў судзе Цэнтральнага раёна. Аляксей Марачкін асуджаны на 5 сутак паводле арт. 17-1 Адміністрацыйнага кодэксу. Аказваецца, як заяўляюць сведкі, мастак лаяўся матам каля Цэнтральнага РУУС Мінска.

**Аргкамітэт звярнуўся да міліцыі**

4 сакавіка – Дзень беларускай міліцыі. З гэтай нагоды Агульнанацыянальны аргкамітэт па святкаванні 90-годдзя БНР звярнуўся да супрацоўнікаў міліцыі з лістом, у якім гаворыцца: "...Органы ўнутраных спраў пакліканы стаяць на варце інтарэсаў грамадзяніна, грамадства, дзяржавы. І сёння беларуская міліцыя мусіць абараняць законныя правы і інтарэсы грамадзян і беларускай дзяржавы, выконваць няпростую функцыю па ахове правапарадку і з'яўляцца гарантам грамадскай бяспекі".

***

**"10 год з аднаго вакна"**

6 сакавіка ў Мінску адкрылася фотавыстава Андрэя Плясанава "10 год з аднаго вакна", прымеркаваная да 90-годдзя БНР. Вядомы мастак, музыка і рэжысёр А. Плясанаў прэзентаваў серыю фотаздымкаў, зробленых у розныя гады з вакна ўласнай кватэры ў цэнтры Мінска. Баявая тэхніка, шматтысячныя калоны дэманстрантаў, кардоны міліцыянтаў, аўтазакі – на здымках А. Плясанава барацьба дзвюх плыняў, змаганне дзвюх ідэяў.

***

**Кубак па міні-футболе**

16 сакавіка ў Брэсце, пасля двух адборачных тураў і паўфіналу, вызначылася чатыры фіналісты "Кубка Незалежнасці". Палітычныя партыі, што ўваходзяць у АДС (БСДП(Г), БНФ, АГП), Брэсцкая абласная арганізацыя Свабоднага прафсаюза Беларускага, маладыя сацыял-дэмакраты і шэраг грамадскіх арганізацый Брэста заснавалі "Кубак Незалежнасці", які будзе кожны год разыгрывацца напярэдадні 25 сакавіка. Турнір праходзіў у адным з мікраранаў горада і выклікаў вялікую цікавасць у жыхароў. Чэмпіёна ўзнагародзяць кубкам, прызёры турніру атрымаюць памятныя медалі, а ўсе ўдзельнікі – памятныя граматы.

***

**Выстава Яўгена Куліка**

19 сакавіка ў Палацы мастацтваў адкрылася выстава мастака, аўтара эталону герба "Пагоня" Яўгена Куліка. Выстава называецца "Гістарычная графіка", на ёй прадстаўлена 80 працаў мастака. Гэта выявы старасвецкіх замкаў і сядзіб, увасобленыя ў графіцы постаці князёў і ўладароў Беларусі, кніжныя ілюстрацыі.

***

**"Гродна – другая сталіца БНР"**

Так называецца серыя паштовак, якую падрыхтавалі гарадзенскія краязнаўцы, гісторыкі. Выданне прысвячаецца 90-годдзю БНР. Паштоўкі зробленыя са старых здымкаў 1918 г., знойдзеных у архівах. Якраз у той час урад БНР вымушаны быў перабрацца з Мінска ў Гродна.

***

**У Старых Дарогах з'явіўся першы помнік БНР**

Яго адкрыццё адбылося 15 сакавіка. Арыгінальны помнік створаны і ўсталяваны на сядзібе музея выяўленчага мастацтва Анатоля Белага. Падзея прымеркаваная да 90-годдзя БНР. Арганізатар урачыстасці — культурна-асветніцкі клуб "Спадчына". Помнік уяўляе сабой ліст жалеза памерам 1,5х2 метры з надпісамі "Заснавальнікам БНР". Тут жа 18 барэльефаў, адлітых з металу, металічны герб "Пагоня", шыльда з надпісам: "Рада Беларускай Народнай Рэспублікі абвяшчае Беларусь незалежнай і суверэннай дзяржавай".

***

**Партыя БНФ выдала паштоўкі да 25 сакавіка**

На трох юбілейных калекцыйных паштоўках выяўлена нацыянальная сімволіка, надрукаваны гімн "Мы выйдзем шчыльнымі радамі". На адной з паштовак – фрагмент літаграфіі В. Сташчанюка з выявай будынку па вуліцы Валадарскага, 9, дзе была абвешчаная БНР, дзве іншыя – з выявамі старога Мінска і Вільні.

***

**"Беларускі пасляваенны антысавецкі супраціў 1944–1959 гадоў"**

У Мінску і рэгіёнах адбылася прэзентацыя дакументальна-мастацкага фільма з такой назвай. Ён зняты паводле кнігі Сяргея Ярша і Сяргея Горбіка "Беларускі супраціў". Гэта 40 хвілін хронікі і мастацкіх здымкаў, прысвечаных пасляваенным падзеям на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

***

**"НезалежныЯ"**

З нагоды юбілею БНР выдадзены музычны зборнік "НезалежныЯ", куды ўвайшлі 15 песень разнастайных стыляў і кірункаў, якія дагэтуль не былі прадстаўленыя публіцы ў музычных альбомах ці сінглах. Мэта праекта – прадэманстраваць еднасць беларускіх выканаўцаў. У альбом увайшлі песні гуртоў "NRM", "Pomidoroff", "Garadzkija", "Zet", "IQ-48", "Siver", "Band A", "B:N:", "Сьцяна", "Partyzone" і іншыя.

***

**Віктарына, прысвечаная БНР**

З 10 да 25 сакавіка на сайце "Радыё Рацыя" адбывалася віктарына. Наведнікі сайту мусілі адказаць на нескладанае пытанне па гісторыі БНР і даслаць першымі правільны адказ на адрас рэдакцыі. Пераможца вызначаўся штодня і атрымліваў адмысловы прыз – музычную складанку "НезалежныЯ" з аўтографамі выканаўцаў.

***

**Агульнанацыянальная дыктоўка**

У Палацы мастацтваў 24 сакавіка "Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына" і мастацкая суполка "Пагоня" для ўсіх жадаючых ладзіла працяг агульнанацыянальнай дыктоўкі.

Асноўная ж дыктоўка адбылася 23 сакавіка. Жадаючыя займалі чэргі, бо залі ТБМ і БНФ, дзе праводзіліся дыктоўкі, не маглі змясціць усіх жадаючых. Арганізатары звярталіся да шэрагу бібліятэк сталіцы з просьбай прадставіць у арэнду памяшканні, але адусюль атрымалі адмовы.

Для тых, хто хацеў напісаць дыктоўку дома, можна было зрабіць гэта дзякуючы трансляцыям па "Еўрарадыё" і "Радыё Рацыі". З панядзелка на сваіх сайтах яны размясцілі тэкст дыктоўкі і ўсе жадаючыя маглі праверыць сябе і паставіць адзнаку. А на сайце "Нашай Нівы" была выстаўлена відэа беларускай дыктоўкі, якую прачытала легендарная беларуская дыктарка Зінаіда Бандарэнка.

Гімнам стала песня Сержука Сокалава-Воюша "Маналог Багушэвіча", дзе ёсць вядомыя словы Багушэвіча: "Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!"

*Паводле інфармацыі "ЗБС "Бацькаўшчына", "Хартыі-97", партыі БСДП (Г), "Нашай Нівы", "Радыё Свабода", "Радыё Рацыя", партыі БНФ, радыё "Нямецкая хваля"*

# ПРЫСВЯЧАЕЦЦА 90-ГОДДЗЮ БНР

Да 90-годдзя Беларускай Народнай Рэспублікі “Згуртаванне беларусаў свету “Бацькаўшчына” ладзіла і ўдзельнічала ў арганізацыі шматлікіх святочных мерапрыемстваў і сустрэч са знакамітымі людзьмі Беларусі, а таксама выпусціла ў свет некалькі друкаваных выданняў.

Падарункам для чытачоў і аматараў гісторыі сталася выданне п’есы **Алеся Петрашкевіча “Приласкать и уничтожить”**, у якой адлюстроўваецца гісторыя станаўлення нашай дзяржаўнасці і раскрываецца пра тое, як стваралася Беларуская Народная Рэспубліка.

Алесь Петрашкевіч зазначае: “Сама ідэя напісання такой п’есы нарадзілася 20 год таму. Падзеі, звязаныя з БНР, – трагічная старонка нашай гісторыі. Калі раней былі ахвяры, рэпрэсіі супраць рэвалюцыянераў, то гэта – катастрофа рыцарскай мары, мары аб светлай будучыні. Мне здавалася, што гэта ў першую чаргу жанр драматургічны, а драматычныя падзеі важна зрабіць эмацыйна. І менавіта ў драматургіі тое можна зрабіць найбольш яскрава, бо калі п’еса пастаўлена – гэта сінтэз аўтара, акцёраў, рэжысёра, святла тэатральнага і адчуванняў гледачоў”.

Гэта 19-я п’еса з серыі гістарычных п’ес аўтара. На дадзены момант Алесь Петрашкевіч працуе над 20-й п’есай, якая закранае мала распрацаваны гістарычны пласт – Напалеон і Беларусь.

Прафесар Лідзія Савік напісала водгук на кнігу А. Петрашкевіча: “Пісьменнік выкарыстоўвае ў трагедыі вобраз пазнавальнага сучасніка-гісторыка. Ён не толькі выразнік аўтарскай пазіцыі, але найперш дасведчаны знаўца і каментатар многіх палітычных сітуацый таго часу, сённяшні віртуальны суразмоўца мужных і адданых рыцараў-змагароў за волю і незалежнасць Бацькаўшчыны. Драматург змог па-мастацку, даходліва, проста і зразумела данесці да чытача складаныя перыпетыі найгалоўнейшай падзеі беларускай гісторыі – стварэння БНР. І было б вялікай падзеяй, калі б гэтую п’есу паставілі беларускія тэатры”.

Другім выданне, прымеркаваным да 90-годдзя БНР, стала выданне “ЗБС “Бацькаўшчына” і Рады БНР насценнага **перакіднога каляровага календара**. Прадмову да яго напісалі першы намеснік старшыні Рады БНР Сяргей Навумчык і гісторык Янка Запруднік. Укладальнікі календара – гісторыкі Алег і Наталля Гардзіенкі. Дарэчы, напрыканцы 2007 г. яны былі ўкладальнікамі і календара “Беларускія мясціны ў свеце”, таксама выдадзенага “Бацькаўшчынай”. На кожны месяц календара размешчана па адным фотаздымку – кіраўнікоў Рады БНР, а таксама старшыняў Ураду БНР, што дзейнічаў у Беларусі. Гістарычныя постаці Янкі Серады, Язэпа Лёсіка, Пётры Крэчаўскага, Васіля Захаркі, Міколы Абрамчыка, Вінцэнта Жука-Грышкевіча, Язэпа Сажыча ды Івонкі Сурвіллы, Язэпа Варонкі, Антона Луцкевіча, Рамана Скірмунта і Вацлава Ластоўскага з аўтографамі паўстаюць на фоне старонак арыгінальных дакументаў, звязаных з дзейнасцю БНР. На адваротным баку кожнага месяца можна пабачыць каляндар на 1918г. і біяграфію аднаго з кіраўнікоў БНР.

Н. Гардзіенка распавяла, з якімі цяжкасцямі сутыкнуліся ўкладальнікі: “Сярод цяжкасцяў можна назваць праблему знайсці якасныя фотаздымкі, бо пераважна маюцца копіі матэрыялаў. Таксама была праблема зняцця якаснай копіі з дакументаў, звязаных з БНР”.

Таксама ў трох гарадах Беларусі – Полацку, Салігорску, Гродна – МГА “ЗБС “Бацькаўшчына” выступіла суарганізатарам **канцэртаў-імпрэзаў**, прысвечаных 90-годдзю БНР. Падчас гэтых імпрэзаў бард Зміцер Бартосік прэзэнтаваў праграму, у якую ўвайшлі песні на вядомыя ўсім вершы Акуджавы, Вярцінскага, Высоцкага ў перакладзе на беларускую мову. Таксама напачатку кожнага канцэрта прысутным прэзентавалася новая кніга журналіста Севярына Квяткоўскага “Фрашкі да пляшкі” – зборніка кароткіх гісторый з жыцця вядомых беларускіх палітыкаў, музыкантаў, літаратараў, мастакоў, журналістаў, а таксама паспалітых людзей: выкладчыкаў, міліцыянераў, рабочых...

“Бацькаўшчына” паспрыяла правядзенню ў Гродна **канцэрта гурту “Стары Ольса”**, прысвечанага Году беларускай дзяржаўнасці. Як заўсёды, гурт сабраў поўную залу. Праграма ўключала шмат твораў з “Полацкага сшытку”, гучалі творы з альбома “Гераічны эпас”, шэраг іншых кампазіцый і песняў.

Пры падтрымцы Згуртавання адбылася сустрэча **чытачоў Слуцка і Салігорска з вядомымі пісьменнікамі Уладзімірам Арловым і Алесем Пашкевічам**. Адбылася прэзентацыя новай кнігі Уладзіміра Арлова “Імёны свабоды”. Куды ўвайшоў 261 гістарычны партрэт дзеячоў XVIII–XXI стст., значнае месца сярод артыкулаў прысвечана “бацькам” БНР. А. Пашкевіч, старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў і аўтар вядомага рамана-дакумента “Пляц Волі”, прысвечанага Слуцкаму збройнаму чыну, распавёў пра гістарычны

*Працяг на стар.10*

# БЕЛАРУСКІ КАЛЯНДАР ПАМЯТНЫХ ДАТ НА КРАСАВІК 2008 Г.

1 красавіка – 640 гадоў таму, у 1548 г. памёр вялікі князь літоўскі Жыгімонт I Стары.

5 красавіка – 215 гадоў таму, у 1793 г. нарадзіўся Канстанцін Радзівіл, палітычны дзеяч, мецэнат, адзін з першых беларускіх фальклярыстаў.

7 красавіка – 25 гадоў таму, у 1983 г. памерла Ларыса Геніюш, паэтэса, вязень ГУЛАГу.

8 красавіка – 105 гадоў таму, у 1903 г. нарадзіўся Аляксандр Скібнеўскі, рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі.

12 красавіка – 155 гадоў таму, у 1853 г. нарадзіўся Станіслаў Людвік Пташыцкі, гісторык, архівіст, даследчык помнікаў старажытнай пісьменнасці Беларусі, Літвы і Польшчы.

18 красавіка – 170 гадоў таму, у 1838 г. нарадзіўся Уладзіслаў Дыбоўскі, заолаг, батанік, палеантолаг, мінеролаг, фалькларыст.

18 карасавіка – 105 гадоў таму, у 1903 г. нарадзіўся Платон Галавач, беларускі пісьменнік і грамадскі дзеяч, расстраляны ў 1937 г.

19 красавіка – 115 гадоў таму, у 1893 г. нарадзіўся Васіль Гарбацэвіч, беларускі драматург, заслужаны настаўнік Беларусі.

26 красавіка – 22 гадоў таму, у 1986 г. адбылася аварыя на Чарнобыльскай АЭС.

26 красавіка – 145 гадоў таму, у 1863 г. нарадзіўся Яўстафій Арлоўскі, беларускі гісторык, краязнаўца і педагог.

28 красавіка – 90 гадоў таму, у 1918 г. Народны Сакратарыят Беларусі зацвердзіў беларускую мову ў якасці дзяржаўнай і абавязковай у БНР і прыняў пастанову аб адкрыцці ў Мінску ўніверсітэта.

8 траўня – 125 гадоў таму, у 1883 г. нарадзіўся Сцяпан Некрашэвіч, беларускі мовазнаўца, акадэмік Акадэміі навук Беларусі.

## ЕЎРОПА

**18–19 сакавіка моладзь Еўропы заклейвала раты статуям**

У ноч з 18 на 19 сакавіка ў розных гарадах па ўсёй Еўропы JEF (Еўрапейскае аб'яднанне Ліberalаў) скаардынавана праводзіла акцыю ў падтрымку дэмакратычнага руху ў Беларусі. Падчас акцыі статуям у розных гарадах на ўсім кантыненце былі "заклееены раты", што сімвалізавала сучасную сітуацыю ў Беларусі. Акрамя таго, на шыі статуй павешаны лозунгі "Еўропа, дай права голасу жыхарам Беларусі!". Такая ж акцыя была пасьпяхова праведзена ў мінулым годзе ў 60-ці еўрапейскіх гарадах і мела вялікі поспех. *Паводле www.jef.eu*

## НЬЮ-ЁРК (ЗША)

**Адкрылася беларуская нядзельная школка ў Нью-Ёрку**

У царкоўна-грамадзкай зале кафедральнага сабору св. Кірылы Тураўскага (401 Atlantic Avenue, Brooklyn, NY 11217) 2 сакавіка распачала сваю працу беларуская нядзельная школка. Асноўныя мэты заняткаў – у цікавай і даступнай форме знаёміць дзетак са Словам Божым, а таксама паглыбляць веданне роднай мовы. Заняткі ўключаюць гісторыі з дзіцячай Бібліі, спевы, маляванне, выцінанне і майстраванне. Плануецца праводзіць такія заняткі двойчы на месяц па нядзелях падчас набажэнстваў з 10 да 12 гадзін. Першай тэмай была тэма стварэння свету. Дзеці спявалі, слухалі адпаведную гісторыю з дзіцячай Бібліі, малявалі, паглядзелі колькі цікавых кніжак з малюнкамі і нават паспрабавалі зрабіць з паперы і аднаразовых талерак краба-скрыпача. Тыя, хто хоча далучыцца, тэлефануйце Галіне Падлескай па нумары: (914) 779-4342.

*Паводле газеты "Беларус"*

## ЧЫКАГА (ЗША)

**Выстава нясвіжца Зміцера Башка**

У Чыкага ў цэнтры для эмігрантаў старэйшага веку "Forever Young" адбылася выстава беларускага мастака Зміцера Башка, які вось ужо 14 гадоў жыве і працуе ў Амерыцы. Ён нарадзіўся ў Салтанаўшчыне каля старажытнага Нясвіжа. Асаблівы каларыт і містыка Нясвіжа і ягоных ваколіцаў будуць прысутнічаць у шматлікіх жывапісных працах Зцімера. З 1994г. з-за хваробы дачкі мастак пераехаў жыць у ЗША. У Чыкага Зміцер быў святаром у беларускай праваслаўнай царкве св. Юр'я, закончыў каледж, атрымаў спецыяльнасць графіка-дызайнера. Зараз працуе ў адной з дызайнерскіх кампаніяў. Ягоныя творы выстаўляліся ў Чыкага на калектыўных экспазіцыях, у тым ліку на памятнай выставе мастакоў з Беларусі "Зямля пад белымі крыламі".

*Паводле газеты "Беларус"*

## РЫМ (ІТАЛІЯ)

**Пад Монтэ-Касіна сустрэліся беларусы Польшчы і Італіі**

У сакавіку сябры "Беларускай Нацыянальнай Памяці" наведалі беларускую дыяспару Італіі. Традыцыйна праграма візітаў уключае наведванне памятных мясцінаў, звязаных з Беларуссю, яе гісторыяй ды культурай, а таксама месцаў мартыралогіі. БНП наведала месца бітвы пад Монтэ-Касіна, дзе ўшанавалі памяць жаўнераў-беларусаў з дывізіі Андэрса, якія загінулі ў тым месцы. Таксама ў Рыме адбыўся шэраг сутрэчаў, сябры БНП наведалі месцы Вечнага Горада, звязаныя з Беларуссю.

*Паводле БНП*

## ВІЛЬНЯ (ЛІТВА)

**125-годдзе з дня нараджэння Францішка Аляхновіча**

9 сакавіка віленскія беларусы — выкладчыкі і студэнты Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта, прадстаўнікі грамадскіх арганізацыяў прынеслі кветкі да памятных мясцінаў, звязаных з Францішкам Аляхновічам. Найперш сабраліся ля капліцы на месцы былых Кальвінскіх могілак, дзе Аляхновіч быў пахаваны пасля забойства ў 1944 г. Тут згадвалі творчасць і жыццё Ф.Аляхновіча, загадкавую гісторыю яго забойства, чыталі ягоныя творы. На месцы старых могілак у Вільні пабудаваны палац шлюбаў, але месца магілы Ф. Аляхновіча прыкладна вядомае з аповедаў старэйшых беларусаў. Адтуль і была ўзятая зямля і перанесеная на Літарацкую горку на могілках Росы ў 1989 г. – гэта сімвалічнае перазахаванне арганізавала Таварыства беларускай культуры Літвы. Помнік Ф. Аляхновічу на Росах скульптар Эдуард Падбярэскі зрабіў бясплатна, з-за недахопу сродкаў – з пластыку. Таму зараз віленскія беларусы спрабуюць аб'яднаць намаганні, каб вырашыць праблему. У створаны аргкамітэт увойдуць прадстаўнікі як беларускіх, так і іншых нацыянальных арганізацыяў Літвы, а таксама Беларусі і замежжа.

***

**Ушанаванне памяці К. Каліноўскага**

22 сакавіка на Лукішскім пляцы віленскія беларусы ўшанавалі памяць Кастуся Каліноўскага, які ў гэты дзень у 1864 г. быў пакараны смерцю. Над пляцам луналі бел-чырвона-белыя сцягі. Пасля прамоваў прысутныя праспявалі нацыянальны беларускі гімн "Магутны Божа", ўсклалі да мемарыялу вянок з бел-чырвона-белых кветак, запалілі свечачы. Потым людзі накіраваліся ў бок праспекта Гедыміна і ўсклалі вянок да помніка ахвярам камунізму, тым самым падкрэсліўшы шлях ад імперска-царскай да камуністычнай Расіі.

***

**У беларускай моладзі Вільні з'явілася новая газета**

Выйшаў у свет першы нумар газеты беларускай моладзі Літвы "Хмара". Газета зарыентаваная на асвятленне падзей і жыцця беларускай маладзёвай грамады, прысутнасць якой у Вільні за апошнія гады стала сапраўды заўважнай. Галоўная ідэя – ператварэнне газеты ў трыбуну беларускай студэнцкай думкі, з мэтай паступовага аднаўлення беларускай студэнцкай традыцыі, найлепшым узорам якой з'яўляецца беларускі маладзёвы рух у Вільні ў міжваенны час.

*Паводле газеты "Свабода" (Літва)*

## ВАРШАВА (ПОЛЬШЧА)

**Пікет у падтрымку Аляксандра Казуліна**

16 сакавіка ў Варшаве каля амбасады Беларусі прайшоў пікет, прымеркаваны да Дня салідарнасці з палітзняволенымі. Удзельнікі пікету трымалі ў руках нацыянальныя беларускія сцягі і фотаздымкі палітвязня Аляксандра Казуліна.

*Паводле "Хартыі-97"*

***

**Ушанаванне памяці Кастуся Каліноўскага**

22 сакавіка ў гадавіну забойства Мураўёвым-вешальнікам К. Каліноўскага варшаўская грамада "Беларускай Нацыянальнай Памяці" ўшанавала яго памяць, запаліўшы сімвалічныя свечкі на магіле блізкай яму асобы – каханай Марыі Ямант (Дмахоўскай).

*Паводле БНП*

## ПРАГА (ЧЭХІЯ)

**Адноўлены выхад газеты "Крывія"**

Адноўлены выхад культурна-асветніцкай газеты беларускай дыяспары Чэхіі "Крывія". У восьмым нумары можна прачытаць пра падзеі, якія адбываліся ў жыцці дыяспары Чэхіі і свету з верасня 2007 да лютага 2008 гг. У далейшым газету плануецца выдаваць штоквартальна, выхад наступнага нумара запланаваны на травень 2008 г.

*Паводле газеты "Крывія"*

## БЕЛАСТОК (ПОЛЬШЧА)

**Бел-чырвона-белы сцяг пад забаронай у Беластоку**

У Беластоку 23 лютага адбываўся гала-канцэрт фестывалю беларускай песні, які арганізавала Таварыства беларускай культуры сумесна з Беларускім грамадска-культурным таварыствам. У фестывалі бралі ўдзел каля 60 музычных калектываў з Польшчы, былі і музыкі з Беларусі. Фінансавую дапамогу святу беларускай песні аказалі Гарадская рада Беластока, ваяводскі Падляшскі ўрад. Была абяцана дапамога і з боку Міністэрства ўнутраных спраў Польшчы. На канцэрце прысутнічалі прадстаўнікі ўрадаў і органаў самакіравання Беларусі і Польшчы. Падчас канцэрту студэнты-каліноўцы Ігар Шчыкарэвіч і Аляксей Трубкін выйшлі да сцэны з бел-чырвона-белым сцягам. Але па загадзе арганізатара мерапрыемства хлопцаў схапілі ахоўнікі, забралі сцяг і вывелі з залы. Потым затрыманых адпусцілі, сцяг вярнулі.

Буйнейшыя грамадскія аб’яднанні беларускай нацыянальнай меншасці Польшчы выказалі сваё абурэнне інцыдэнтам, накіраваўшы адпаведную заяву Дональду Туску, старшыні Рады міністраў Рэспублікі Польшча.

“Бел-чырвона-белы сцяг быў устаноўлены афіцыйным дзяржаўным сцягам выбіваючайся на незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі 25 сакавіка 1918 года і незалежнай Рэспублікі Беларусь у 1991 годзе.

Мы, польскія беларусы, падымалі гэты сцяг з паловы 1980-х гадоў, калі студэнты, члены Беларускага аб’яднання студэнтаў, адважыліся выступіць пад ім. На працягу 20 гадоў, пры любых урадах – камуністычных, посткамуністычных ці постсалідарніцкіх – ніхто ў Польшчы не падняў руку на гэты сцяг, аж да мінулай суботы. Прытым адбылося гэта ў прысутнасці прадстаўнікоў польскіх парламентарыяў і мясцовых дэпутатаў, падляшскіх і беластоцкіх самаўрадавых улад, з якіх ніхто не адрэагаваў на гэты скандальны ўчынак”, – гаворыцца ў звароце.

Першая рэакцыя на ліст з’явілася ад прэзідэнта Беластока Тадэвуша Тускалянскага, які выказаў шкадаванне з прычыны інцыдэнта. Пра гэта паведаміў “Радыё Рацыя” Патрык Газдэцкі з прэсавага бюро горада: “Спадар прэзідэнт выказвае шкадаванне, што такі інцыдэнт меў месца, выказвае таксама спадзяванне, што такія інцыдэнты не будуць паўтарацца ў будучыні. Прэзідэнт лічыць, што ўсякія нацыянальныя сімвалы павінны злучаць людзей, а не дзяліць іх”.

Раней шкадаванне з прычыны інцыдэнта выказаў і падляшскі ваявода Мацей Жыўно. Прэс-сакратар ваяводы Ёлянта Гадэк сказала: “Ваявода азнаёміўся са зместам ліста і выказвае шкадаванні з прычыны інцыдэнта. Зараз чакаем рэакцыі ўраду, паколькі ліст быў накіраваны прэм'ер-міністру Дональду Туску”.

*Паводле “Радыё Рацыя”*

## МАСКВА (РАСІЯ)

**Мастацкі праект “35–”**

Беларускі саюз мастакоў прадставіў у Маскве праект “35–”. Яго прэзентацыя адбылася ў Цэнтральным доме мастакоў на Крымскім вале Маскоўскага міжнароднага мастацкага салона. Беларускі саюз мастакоў прывёз у расійскую сталіцу каля двух дзесяткаў жывапісных і скульптурных работ. Агульнае ў іх адно: усе іх аўтары маладзей за 35 год, таму і праект атрымаў такую назву. Яго ўдзельнікамі сталі маладыя мастакі і скульптары – пераможцы нядаўняга конкурсу беларускага сучаснага мастацтва.

*Паводле прэс-службы амбасады Рэспублікі Беларусь у Расіі*

***

**Пікет, прысвечаны “Справе дванаццаці”**

16 сакавіка прадстаўнікі беларускай дыяспары ў Маскве, актывісты руху “Абарона” і неабыякавыя грамадзяне правялі акцыю салідарнасці з ахвярамі палітычных рэпрэсій у Беларусі. Каля 30 чалавек сабраліся насупраць беларускай амбасады ў Маскве з патрабаваннем вызвалення палітвязняў і спынення пераследу апазіцыі. Напрыканцы акцыі ў паветра былі выпушчаны шары з прывязаным да іх нацыянальным бел-чырвона-белым сцягам. Акцыя была прысвечана так званай “Справе дванаццаці” – крымінальнай справе супраць удзельнікаў і арганізатараў пратэсту прадпрымальнікаў, якія ў студзені патрабавалі адмены новага загаду, што забараняе індывідуальным прадпрымальнікам наймаць на працу кагосьці акрамя сваякоў.

*Паводле сайта “Беларуская Масква”*

***

**Беларуская дуда**

1 сакавіка ў Расійскай дзяржаўнай бібліятэцы адбылася сустрэча прадстаўнікоў беларускай дыяспары Масквы з супрацоўнікамі этнакасмалагічанага цэнтра “Крыўя” Аляксеем Дзермантам і Тодарам Кашкурэвічам. Пасля таго, як сп. Аляксей распавёў пра сутнасць “крыўскай ідэі”, слова ўзяў сп. Кашкурэвіч які расказаў пра паходжанне беларускай дуды, яе канструкцыйныя асаблівасці, а таксама пра яе ролю і месца ў культуры Беларусі.

*Паводле сайта “Беларуская Масква”*

## ТАЛІН (ЭСТОНІЯ)

**Першы кангрэс маладой беларускай дыяспары Еўропы і ЗША**

Ён адбыўся 1–5 сакавіка ў Таліне. У мерапрыемстве бралі ўдзел беларусы са Швецыі, Літвы, Польшчы, Францыі, Германіі і ЗША. З вітаннем выступіў міністр замежных спраў Эстоніі Урмас Паэт. Паводле У. Паэта, істотную ролю ў развіцці дэмакратыі ў Беларусі адыгрываюць замежныя дыяспары, у тым ліку і Эстоніі. Кіраўнік эстонскага МЗС выказаў упэўненасць, што кангрэс пакладзе пачатак супрацоўніцтву розных беларускіх арганізацыяў.

А. Макоўская, старшыня “Бацькаўшчына” падкрэсліла: “Такога кшталту сустрэчы карысныя, яны дазваляюць стварыць пляцоўку для дыскусій, абмену вопытам, а самае галоўнае – дапамагаюць наладзіць супрацоўніцтва паміж беларусамі розных краін”.

*Ул.інф.*

### 90-ГОДДЗЕ БНР У ЗАМЕЖЖЫ

## ТАРТУ (ЭСТОНІЯ)

**Беларуская дыктоўка праходзіла ў Тартускім універсітэце**

Гэта адзін са старэйшых універсітэтаў Еўропы, заснаваны ў 1632 г. Дыктоўку пісалі студэнты з Беларусі, якія працягваюць навучанне ў Эстоніі пры падтрымцы ўраду гэтай рэспублікі. Сама акцыя знайшла падтрымку і сярод выкладчыкаў эстонскай мовы, якія ведаюць, што значыць Родная мова, і што з яе пачынаецца сапраўдная дзяржаўнасць.

*Паводле Ігара Случака*

***

**Акцыя “Беларусь — апошняя дыктатура Еўропы”**

25 сакавіка маладыя беларусы выйшлі на цэнтральную плошчу Тарту, каб распавесці пра падзеі ў Беларусі. Яны распаўсюджвалі інфармацыйныя буклеты пра парушэнні правоў чалавека ў Беларусі, CD-кружэлкі з фільмам “Плошча”, бранзалеткі з нацыянальнай беларускай сімволікай.

*Паводле “Еўрапейскага радыё для Беларусі”*

# ХВЕДАРУ НЮНЬКУ – 80 ГОД



6 красавіка святкуе 80-годдзе нязменны кіраўнік Таварыства беларускай культуры Літвы, вядомы грамадскі дзеяч беларускай дыяспары Хведар Нюнька.

Ён нарадзіўся ў 1928 г. у вёсцы Алешавічы Мастоўскага раёна, а з 1934 г. жыве ў Вільні. З 1980-х гг. вядзе актыўную дзейнасць па адраджэнні беларускасці ў Літве. У 1989 г. сп. Хведар стаў адным з ініцыятараў заснавання Таварыства беларускай культуры ў Вільні. Менавіта яго намаганнямі ў ТБК і яго Раду ўвайшлі вядомыя ў літоўскім грамадстве людзі, нашчадкі беларускай інтэлігенцыі пачатку XX ст. – Лявон і Юрка Луцкевічы, Лявон Кароль, Яраслаў Станкевіч, Сяргей Карабач, Мікола Рулінскі.

Сп. Нюнька з'яўляецца ініцыятарам вялікай колькасці грамадскіх, культурных акцый у Літве, актыўна прапагандуе беларускую культуру, прыкладае шмат намаганняў дзеля ўшанавання памяці беларускіх грамадскіх і культурных дзеячаў у Вільні. У 1997 г. ён стаў сябрам Рады БНР. Сябра Вялікай Рады МГА "ЗБС "Бацькаўшчына", Беларускага Народнага Фронту.

Ад імя Управы ЗБС "Бацькаўшчына" віншуем Вас з юбілеем. Зычым здароўя, душэўных сіл, каб вашае меркаванне надалей заставалася важным для беларусаў Літвы, каб ажыццявіліся планы, звязаныя з прапагандай беларускасці ў свеце.

## 40 ГОД СПАЎНЯЕЦЦА АЛЕГУ РУДАКОВУ

29 красавіка юбілей Алега Рудакова – старшыні Іркуцкага таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага. Яму споўніцца 40 год.

Менавіта Алег Рудакоў – малады вайсковец – у 1995 г. стаў рухавіком стварэння суполкі беларусаў ля Байкала. Нават на Радзіме цяжка захаваць нацыянальную адметнасць. Алегу ж далёка ад Беларусі гэта ўдалося не толькі самому – ён знайшоў аднадумцаў, зацікавіў іх беларускасцю і стварыў рознабаковую па сваёй дзейнасці арганізацыю – Таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага. Дзякуючы яго апантанасці, нязгаснай энергіі і аптымізму абуджаны інтарэс да сваіх каранёў нават у тых беларусаў, якія ніколі не былі на гістарычнай Радзіме. Пад кіраўніцтвам Алега Рудакова створана некалькі аддзяленняў Таварыства, больш дзесятка беларускіх калектываў, якія працуюць у разнастайных накірунках, ладзяцца дні беларускай культуры, прэзентацыі беларускіх выданняў і фільмаў, выдаецца газета "Маланка", ладзяцца агульнагарадскія беларускамоўныя дыскатэкі. І гэты пералік можна доўжыць…

ЗБС "Бацькаўшчына" выказвае падзяку Алегу Рудакову за шматгадовую, плённую працу на ніве беларушчыны! Жадае здароўя, шчасця, поспехаў у новых пачынаннях і нязгаснага аптымізму!

## 80 ГОД ЮРКУ СТАНКЕВІЧУ

18 сакавіка споўнілася 80 год заснавальніку Беларускага клубу ў Празе, рэдактару газеты беларусаў у Чэхіі "Крывія" Юрку Станкевічу.

Свае жыццёвыя намаганні Вы скіравалі на папулярызацыю беларускасці ў свеце, дзякуючы Вам беларуская мова і гісторыя прапагандавалася на двух кантынентах – еўрапейскім і амерыканскім. Ваша праца настаўнікам у надзельных школках для беларускай дыяспары ў амерыканскіх штатах Нью-Ёрку, Нью-Джэрсі, Агая і ў чэшскай сталіцы Празе, выданне падручніка беларускай мовы і гісторыі Беларусі, запіс беларускай версіі "Трыстана і Ізольды", апрацоўка кароткага размоўніка беларускай мовы для англамоўных з'яўляецца прыкладам для працы дзеячоў дыяспары. Ваша адданасць беларускасці вартая Вялікай пашаны.

У гэты юбілейны для Вас год Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына" зычыць Вам і надалей працягваць актыўны ўдзел у грамадскім жыцці беларускай дыяспары, здароўя і рэалізацыі мэтаў, якія Вы ставіце перад сабой.

## ВІНШАВАННІ СЯБРАМ ВЯЛІКАЙ РАДЫ

Маем гонар павіншаваць з Днём нараджэння сяброў Вялікай Рады арганізацыі, якія нарадзіліся ў красавіку: Уладзіміра Конана, Сяргея Чыслава (Беларусь), Алеся Карповіча (Латвія), Алену Глагоўскую (Польшча), Сяргея Бандарэнку (Расія), Барыса Кіта (Нямеччына). Прыміце ад нас шчырыя пажаданні шчасця, доўгага жыцця, выдатнага здароўя, натхнёнай працы, духоўнай і творчай самарэалізацыі!

28 красавіка **Валянціна Арлова (Аксак)** адзначае юбілей. З творчасцю Валянціны Аксак знаёмыя далёка па-за межамі Беларусі. Яна радуе не толькі аматараў паэзіі сваімі новымі творамі, а і слухачоў "Радыё Свабода" высокапрафесійнымі матэрыяламі. Віншуем шаноўную спадарыню Валянціну і жадаем творчых поспехаў, нязгаснага аптымізму, шчасця!



## ГАЗЕТА “БЕЛАРУС” (ЗША) ЗБІРАЕ МАСТАЦКІЯ ТВОРЫ ДЛЯ ВЫДАННЯ БЕЛАРУСКАГА АЛЬМАНАХУ

Рэдакцыя “Беларуса” працягвае падрыхтоўку да друку альманаху твораў беларускіх пісьменнікаў замежжа “БЕЛАРУС–2008”. Змясціць свае творы ў альманаху маюць права ўсе аўтары, якія пішуць па-беларуску ў самых розных літаратурных жанрах. Адзінае патрабаванне – аўтары павінны жыць па-за межамі Беларусі. Плануемы час выхаду альманаху ў свет – жнівень 2008 г. Свае творы аўтарам найлепш дасылаць у рэдакцыю электроннай поштай на адрас: hazetabielarus@att.net У выключных выпадках, калі аўтары не маюць доступу да Сеціва, творы можна даслаць поштаю, запісанымі на CD ці DVD альбо надрукаванымі на паперы на адрас рэдакцыі: BIELARUS / P. O. Box 3225 / Farmingdale, NY 11735 USA

Тэксты пажадана пісаць тарашкевіцай. Творы, напісаныя наркамаўкай, у альманаху будуць надрукаваныя тарашкевіцай. Кожнаму аўтару пажадана таксама даслаць свой невялікі партрэтны здымак і кароткую аўтабіяграфію і, пры жаданні, дадатковую інфармацыю пра сябе, якую яны хацелі б паведаміць сваім чытачам.

Апошні тэрмін для дасылкі твораў – 31 траўня 2008 г. Пасля выхаду альманаху ў свет кожны аўтар атрымае адзін асобнік бясплатна.

*Паводле газеты “Беларус”*

## ВЫДАДЗЕНЫ ПЕРШЫ ЎНІКАЛЬНЫ “ЕЎРАСЛОЎНІК”

У выдавецтве “Радыёла-Плюс” выдадзены тысячным накладам “ЕўраСлоўнік” Лявона Баршчэўскага. Гэта ўнікальнае выданне не толькі ў айчыннай, але і ў сусветнай лексікаграфіі. Ён уключае каля 100 000 адзінак перакладу і прызначаны найперш для чытання і разумення інфармацыйных, публіцыстычных, навукова-папулярных і мастацкіх тэкстаў, даступных у друкаваным выглядзе альбо ў Сеціве. Гэта першы 28-моўны слоўнік.

## ЗБОР СРОДКАЎ НА ВЫДАННЕ КНІГІ ВАСІЛЯ БЫКАВА

МГА “ЗБС “Бацькаўшчына” працягвае збор сродкаў на кнігу “Васіль Быкаў”. Гэтая кніга, у якой упершыню падрабязна, з пацвярджэннем кожнага факта дакументамі распавядаецца і пра жыццё, і пра творчасць Васіля Быкава. Не абмінуў яе укладальнік Сяргей Шапран і пахаванне В.Быкава, звязаны з ім грамадскі рэзананс, калі развітацца з народным пісьменнікам прыйшлі дзесяткі тысячаў беларусаў. Акрамя таго, у кнізе шырока прадстаўленая літаратурная крытыка на творы В. Быкава, ягоныя выступы, стэнаграмы выступаў пісьменнікаў, партыйных дзеячоў, закрытыя выдавецкія рэцэнзіі і інш., успаміны пра В. Быкава пісьменнікаў, сяброў і родных, перапіска (большасць лістоў прадстаўлена ўпершыню).

Шаноўнае спадарства! Выдадзім гэтую ўнікальную кнігу талакой! Усіх ахвотных дапамагчы просім звяртацца па тэлефонах:

+375 29 632 00 92 (Алена Макоўская) альбо

+375 29 625 83 78 (Ніна Шыдлоўская).

*МГА “Згуртаванне беларусаў свету “Бацькаўшчына”*

## ДАЛУЧАЙСЯ ДА “КЛІП-МАРАФОНУ”

У красавіку выходзіць DVD-зборнік з беларускімі кліпамі канца XX – пачатку XXI стст. пад назвай “Кліп-марафон”. Унікальны зборнік мяркуе сабраць музычныя ролікі “класікаў” беларускага року і маладых гуртоў. Творы будуць размеркаваныя па намінацыях “Анімацыйныя кліпы”, “Чорна-белыя”, “Цяжкая музыка”, “Мінская вясна” і г.д. Паколькі стваральнікі “Кліп-марафону” хочуць змясціць як мага болей кліпаў, то збор ролікаў працягваецца! Трапіць у зборнік можа абсалютна любы беларускі гурт, што мае кліп. Па арганізацыйных пытаннях звяртайцеся тэл.: 649 08 88 (маб.) альбо

e-mail: vitaut.super88@gmail.com

## ДА БОГА – З БЕЛАРУСКАЙ МАЛІТВАЙ

У Сеціве апублікаваны “Царкоўнаславянска-беларускі слоўнік рэлігійных і багаслоўскіх тэрмінаў”. Ён быў складзены Біблійнай камісіяй Беларускай праваслаўнай царквы па добраславенні мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта яшчэ ў 2004 г. і тады друкаваўся ў малатыражнай газеце «Царкоўнае слова». Цяпер яго для шырокага азнаямленьня апублікаваў у электронным выглядзе сайт Churchby.info. На гэтым жа рэсурсе прыцягвае ўвагу артыкул Сергія Гардуна “Навошта патрэбнае богаслужэнне на беларускай мове?”

*Паводле “Нашай Нівы”*

## НАВІНЫ “БАЦЬКАЎШЧЫНЫ” ДА 90-ГОДДЗЯ БНР

*Працяг. Пачатак на стар.6*

шлях нашай Бацькаўшчыны. Акрамя таго, упершыню ў гэтых гарадах (нават раней за сталіцу) адбылася прэзентацыя кнігі старшыні Рады БНР Івонкі Сурвіллы “Дарога”.

Да 90-х угодкаў БНР была прымеркавана і сустрэча чытачоў з вядомай беларускай пісьменніцай Вольгай Іпатавай. У Маладзечна пісьменніца прэзентавала кнігу з серыі “Бібліятэка Бацькаўшчыны” — “Мы стваралі сваю Беларусь” Вольгі Грыцук. (В. Іпатава – укладальніца кнігі).

*Інфармацыйны цэнтр МГА “ЗБС “Бацькаўшчына”*

## НАШЫ ПРАБАЧЭННІ

19 лютага “ЗБС “Бацькаўшчына” зладзіла вечарыну памяці Кастуся Акулы. У артыкуле, які быў размешчаны ў бюлетэні пра гэта, пры скарачэнні аб’ёму па тэхнічных прычынах “знікла” вельмі важная інфармацыя: адным з ініцыятараў, вядучай вечарыны была вядомая беларуская пісьменніца Вольга Іпатава. Без яе ўдзелу, без яе творчага, прафесійнага падыходу вечарына ўвогуле магла б не адбыцца. Мы просім прабачэнне ў спадарыні Вольгі за ўзніклую недарэчнасць.

*Ніна Шыдлоўская, намесніца старшыні Рады МГА “ЗБС “Бацькаўшчына”*

**Беларусы ў свеце**
№3 (74), сакавік 2008

Інфармацыйны бюлетэнь МГА “ЗБС “Бацькаўшчына”. Распаўсюджваецца на правах унутранай дакументацыі.

Меркаванні аўтараў могуць не супадаць з думкай рэдакцыі.
Апрацоўка і вёрстка – М. Азаронак
Адказныя за нумар – А. Макоўская, Н. Шыдлоўская

Наклад 250 асобнікаў

Адрас рэдакцыі:
вул. Рэвалюцыйная, 15, г. Мінск
220030, Рэспубліка Беларусь
www.zbsb.org
zbsb@lingvo.minsk.by; zbsb@tut.by

тэл./факс (+375 17) 224-79-35